# КАНЦЭПТ «ЗЯМЛЯ» Ў ПАЭМЕ ЯКУБА КОЛАСА «НОВАЯ ЗЯМЛЯ»

***С. А. Розава***

Выходзячы з агульнапрынятага ў філасофіі і літаратуразнаўстве вызначэння канцэпту як устойлівай аўтарскай ідэі, якая мае традыцыйнае выражэнне, паспрабуем раскрыць змест і сэнсавае значэнне канцэпту «Зямля» ў паэме Якуба Коласа «Новая зямля».

У класічнай беларускай паэтыцы вобраз Зямлі традыцыйна займае цэнтральнае месца. Зямля – асноўны міфапаэтычны вобраз-сімвал. Ужо ў ранніх светаўяўленнях беларусаў Зямля надзялялася незвычайнымі якасцямі: продкі верылі, што Зямля мае здольнасць да саманараджэння і самаўзнаўлення. Можна меркаваць, што менавіта адсюль бярэ свой пачатак культ Маці-Зямлі, трывала замацаваны ў народнай свядомасці.

Зямля – выток жыцця, аснова арганічнага існавання чалавека. Жыццёвы цыкл селяніна ў многім вызначаў земляробчы каляндар. У выніку земляробчай практыкі фарміраваўся тып мыслення беларуса, які на працягу доўгага часу заставаўся пераважна «аграрным».

Адносіны чалавека да зямлі як першаасновы жыцця знайшлі мастацкае асэнсаванне ў паэме Якуба Коласа «Новая зямля».

У цэнтры ўвагі пісьменніка – традыцыйная сялянская сям'я. Галоўны герой паэмы Міхал служыць лесніком ў пана, але ўвесь час яго не пакідае думка набыць сваю зямлю: *Даўно ўжо бацька жыў думою/ Разжыцца ўласнаю зямлёю//І не належаць ні да кога,/ Не знаць начальства ніякога*. Міхал справядліва лічыць, што зямля павінна належаць таму, хто на ёй працуе. У вусны галоўнага героя Якуб Колас укладвае спрадвечную мару многіх пакаленняў беларускага сялянства: *Купіць зямлю, прыдбаць свой кут,/ Каб з панскіх выпутацца пут,/ І там зажыць сабе нанова:/ Свая зямля – вось што аснова!*.

Зямельнае пытанне заўсёды заставалася для селяніна-земляроба «балючым», магчыма, яшчэ і таму, што мара аб уласнай зямлі цесна звязана з такой тыповай рысай беларуса, як імкненне да незалежнасці, і выяўляе традыцыйную іпастась селяніна-гаспадара, якая бярэ свой пачатак з эпохі аграрнага неаліту.



Зямля – каштоўнасць не толькі матэрыяльная. Гэта своеасаблівы гарант абароненасці і небяспекі: *Тым болей бацьку прыцягала/ Свая зямелька, свая хата/ ... Прытулак свой, куток уласны.*

Жыццёвая філасофія Міхала ўкладаецца ў простую, на першы погляд, формулу: *Купі зямлю ды замацуйся,/ ... Дзе можна моцна і глыбока/ Пусціць карэнні ў грунт, абжыцца.* Але за гэтай прастатой адчуваецца і клопат аб будучым дзяцей і сямейным дабрабыце, і ўласцівыя беларусам грунтоўнасць і разважлівасць.

Мастацкае параўнанне «*пусціць карэнні ў грунт, абжыцца*» змяшчае ў сабе філасофскую алегорыю. Звяртаючыся да яго, Я. Колас імкнецца адлюстраваць прыродны стан чалавека, максімальна набліжае яго да арганічнага свету.

Усведамленне бясконцага развіцця, бязмежнасці і, разам з тым, універсальнага адзінства свету дае чалавеку магчымасць адчуць сябе часткай універсуму, далучыцца да ўстаноўленага сусветнага парадку, і менавіта Зямля з'яўляецца гэтым пасрэднікам-праваднікам [2, с. 18], набываючы тым самым аксіялагічнае значэнне.

Гарманічнае суіснаванне з прыродай, вольная праца на ўласнай зямлі ўтвараюць традыцыйную сістэму жыццёвых каардынат селяніна-земляроба. Адсюль яшчэ адзін распаўсюджаны ў беларускай літаратуры культ «натуральнага» чалавека, анталагічную сутнасць якога складае класічная трыяда: Прырода – Праца – Зямля. «Тры кіты» сялянскага мікракосму. Спрадвечныя асновы існавання беларуса, многімі пакаленнямі продкаў узведзеныя ў абсалют. Гэта адзіны жывы арганізм, складаная сістэма, у якой чалавек – рухавік, механізм, які прыводзіць сістэму ў дзеянне. Зямля ж у гэтым спрадвечным трыадзінстве забяспечвае ўзаемападпарадкавальную сувязь: Прырода ёсць жыццёвая прастора чалавека; Зямля – частка арганічнай прыроды, Праца на зямлі – спосаб сатворчасці чалавека і прыроды.

Зямля – не толькі жыццёвая глеба, якая забяспечвае чалавеку біялагічнае існаванне. Штодзённая, «заложная» праца селяніна-земляроба надае Зямлі стваральны сэнс.

Зямля – жыццясцвярджальны пачатак, крыніца вітальных сіл. Існавала павер'е, што хворы ці стомлены чалавек мог проста легчы на зямлю, і яна перадавала яму сваю хтанічную сілу, напаўняла жыццёвай энергіяй.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Зямля – сімвал нараджэння. Традыцыйна ў беларускай эстэтыцы зерне, кінутае ў раллю, сімвалізуе пачатак новага жыцця. Але, разам з тым, Зямля ёсць і апошні прытулак чалавека, непасрэдна звязана са смерцю, што знаходзіць пацвярджэнне ў радках паэмы: *О край мой мілы! Усёй душою/ Хачу злучыцца я з табою,/ /У тваіх палях пазычыць сілу,/ У тваёй зямлі сысці ў магілу...*

Спрадвечнае процістаянне жыцця і смерці, складаючы метафізічнае па сваёй прыродзе адзінства ўзаемавыключных катэгорый і выяўляючы першапачатковую супярэчнасць быцця, ў дадзеным кантэксце страчвае сваю антанімічнасць і набывае аднароднасць. Гэта дыялектычная супярэчнасць захавала ў сабе рэшткі архаічна-язычніцкага светаадчування. Жыццё і смерць уяўляюцца чалавеку вечным кругазваротам пераўтварэнняў [1, с. 27]. Зямля адпаведна ўспрымаецца чалавекам як месца гэтых пераўтварэнняў і набывае сакральны сэнс.

Праз адносіны селяніна да Зямлі Якуб Колас у паэме адлюстраваў тыповыя рысы беларуса: працавітасць, гаспадарлівасць, вынослівасць, пакорнасць лёсу, пачуццё чалавечай годнасці, што ў сукупнасці складаюць своеасаблівы нацыянальны фенатып.

Прыналежнасць да зямлі, разуменне прыгнёту як агульнага гістарычнага лёсу, як ні парадаксальна, нарадзіла і спрадвечны тыпова беларускі аптымізм: *Узброй надзеямі нам грудзі,/ Бо мы твае, зямелька, людзі!* Тут упершыню гучыць ідэя яднання беларускай нацыі, якая атрымала развіццё ў больш позніх творах Якуба Коласа.

Так, у паэме «Новая зямля» аўтар раскрывае значэнні канцэпту «Зямля» ад энцыклапедычнага да сакральнага.

***Літаратура***


1. Казакова, І. В. Этнічныя традыцыі ў духоўнай культуры беларусаў / І. В. Казакова. – Мінск, 1995.
2. Казбярук, У. М. Паэма Якуба Коласа «Новая зямля»: у святле славянскіх традыцый / У. М. Казбярук ; рэд. І. Я. Навуменка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1979. – 112 с.
3. Никольский, С. А. Земледелие и крестьянство как природно-историческое явление / С. А. Никольский // Вопросы философии. – 1991. – № 2.




# ЛЕКСИЧЕСКАЯ РЕПРЕЗЕНТАЦИЯ МОДАЛЬНОСТИ ВИЗУАЛЬНОГО ВОСПРИЯТИЯ

***М. О. Филиппович***

*В статье описывается лексика визуальной модальности, представленная в «Толковом словаре русского языка» С. И. Ожегова и Н. Ю. Шведовой; конкретизируются понятия визуальной модальности и семантического поля, проанализированы лексические единицы внутри семантического поля зрительного восприятия со стороны объекта и субъекта восприятия и приведена их авторская классификация.*

В последние годы в лингвистической науке проводится большое количество исследований, рассматривающих представление различных сенсорных систем в языке. Ситуация восприятия изучается с позиций представленности ее компонентов на разных уровнях языка: лексическом, синтаксическом, словообразовательном и т. п. Мы остановимся на лексической репрезентации *визуальной модальности.*

Самую главную и самую большую по объему информацию о внешнем мире человек получает благодаря зрению: мы в первую очередь видим окружающий нас мир и лишь во вторую очередь воспринимаем его с помощью слуха, осязания, обоняния и вкусовых рецепторов. Зрительная информация представляется наиболее полной и точной. Доминирование зрения над другими сенсорными системами отражается непосредственно в лексическом строе языка – при отборе компонентов, формирующих значение слова как таковое.

Предметом описания в данной статье является лексика зрительного восприятия, представленная в «Толковом словаре» С. И. Ожегова и Н. Ю. Шведовой (80 000 слов). Для системной характеристики предмета описания следует очертить *«семантическое поле»*, к которому мы относим всю лексику интересующей нас модальности.

Термином «поле» принято обозначать *«совокупность языковых единиц, объединенных общностью содержания... и отражающих понятийное, предметное или функциональное сходство*



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ